Сядзі і глядзі

# ПАЎЛІНКА І ШЛЮБНАЯ НОЧ

**Экранізацыі любімых твораў беларускіх класікаў зноў зможам убачыць у эфіры сацыякультурнага тэлеканала на наступным тыдні.**

Народная камедыя «Паўлінка» ад рэжысёра Аляксандра Зархі будзе чакаць сустрэчы з гледачамі ў сераду, 7 ліпеня. Кінастужка стала экранізацыяй спектакля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы па аднайменным творы беларускага пісьменніка Янкі Купалы (1912). Змест гэтага твора кожнаму з нас знаёмы са школьных гадоў, але ўсё ж нагадаем. Паўлінка, дачка заможнага селяніна Сцяпана Крыніцкага, і настаўнік Якім Сарока кахаюць адно аднаго. Калі аднойчы пра гэта дазнаецца бацька дзяўчыны, то забараняе ёй бачыцца з маладым чалавекам. І каб разлучыць пару, ён ідзе з даносам у паліцыю: маўляў, у Якіма маецца забароненая літаратура. Паколькі Сцяпан Крыніцкі марыць парадніцца са шляхтай, то задумвае выдаць сваю дачку за знатнага жаніха — шляхціча Адольфа Быкоўскага. Але ж жаніх з «сюрпрызам», бо за кошт шлюбу жадае выправіць сваё незайздроснае матэрыяльнае становішча. І ў выніку перад заканаванымі паўстае пытанне: ці змірыцца, ці збегчы разам, як тое прапануе Паўлінцы Якім? Выбар не з простых, але ж сэрца заўсёды ведае адказ.

У чацвер, 8 ліпеня, на экраны выйдзе псіхалагічная драма «Вясельная ноч». Фільм зняў на «Беларусьфільме» ў 1980 годзе рэжысёр Аляксандр Карпаў-старэйшы. У аснову кінастужкі лягла аповесць Івана Шамякіна «Шлюбная ноч». ...Летам 1942 года, у першы раз ад пачатку вайны, Валя ўбачылася са Сцяпанам. Ён аказаўся тым самым чалавекам з гарадскога падполля, да якога яна прыйшла. Так аднавілася іх каханне. Каб трапіць у горад, гераіня нават спецыяльна выпрошвала для сябе небяспечныя заданні. Летам 1943 года партызаны і падпольшчыкі рыхтавалі сумесную аперацыю па бамбардзіроўцы чыгуначных шляхоў, каб не дазволіць немцам перагнаць пад Курск і Арол ваенныя эшалоны. Для каардынацыі дзеянняў з Вялікай зямлёй у атрад прылятае разведчыца Марыя. Але з моманту, калі Валя пазнаёміла Марыю са Сцяпанам, яна страціла спакой. А потым... трапіла на іх вяселле. Што кранае больш — драматычны фінал або ўменне герояў радавацца жыццю і каханню насуперак абставінам, кожны з нас няхай вырашыць для сябе сам.

Глядзіце і згадвайце любімыя творы, якія застаюцца заўсёды актуальнымі і не пакідаюць абыякавымі.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 123

Сваю новую задачу прапануе наш пастаянны чытач Міхаіл Кошаль з Мінска (*гл. дыяграму*).



**Белыя:** Крb7, Фb3, Лh5, Сс8, Сd4, Kf5, Kg7, пп. d6, g2 (9).

**Чорныя:** Крd5, Лс4, Лd1, Сg8, Kf2 (5).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Кампазіцыі Сяргея Дарошчанкі адрасаваны найперш шахматыстам-пачаткоўцам.

**№ 1**

Белыя: Крh8, Ла1, Cd1, Cg1, Kh4 (5).

**Чорныя:** Крh1, Фс3, Са5, Сс8, Kf6, пh2 (6).

Мат за 2 хады

**№ 2**

**Белыя:** Kpe7, Kh6, пп. f5, g4 (4).

**Чорныя:** Крh8, пп. g6, g7, h7 (4).

Мат за 3 хады.

* * *

Прапануем яшчэ некалькі партый сёлетніх чэмпіянатаў Беларусі.

Аляксей Аляксандраў — Арцём Сіняўскі. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kc3 Cb4 4. f3 d5 5. a3 C:c3+ 6. bc 0-0 7. cd ed 8. e3 Cf5 9. Ke2 c5 10. dc Фa5 11. Kd4 Cg6 12. Фb3 Ф:c5 13. c4 Kc6 14. K:c6 Ф:c6 15. Cb2 Лac8 16. Лc1 Лfe8 17. Kpf2 Фe6 18. cd K:d5 19. Cc4 Л:c4 20. Л:c4 K:e3 21. Лb4 Kd5 22. Л:b7 Фe2+ 23. Kpg3 Ke3 24. Лg1 h5 25. h4 Kf5+ 26. Kph2 Фf2 27. Фa4 Kd6 28. Лb4 Лe4 29. Л:e4 C:e4 30. Лh1 C:f3 31. Лg1 Ke4 32. Фe8+ Kph7, 0:1.

Кацярына Бейненсон — Яна Ільючык. 1. e4 c5 2. Kf3 Kc6 3. d4 cd 4. K:d4 Kf6 5. Kc3 d6 6. Ce3 e5 7. Kb3 Ce6 8. Фd2 Ce7 9. f3 0-0 10. 0-0-0 a5 11. Фf2 Фb8 12. Kpb1 Лc8 13. Cb5 Kb4 14. a3 a4 15. Kc1 d5 16. ab d4 17. C:d4 ed 18. Ф:d4 a3 19. b3 Лd8 20. Фb6 Фe5 21. K1e2 a2+ 22. K:a2 Лdc8 23. Ca4 Л:a4 24. f4 Ф:e4 25. Kec3 Ф:g2 26. ba C:a2+ 27. Kpb2 Ce6 28. Лhe1 Cf5 29. Лe2 Фf3 30. Фd4 Cf8 31. Лe3 Фf2 32. Лd2 Фf1 33. Лg3 Лc4 34. Лd1 Л:d4 35. Л:f1 Л:b4+ 36. Kpc1 Cd6 37. Лgf3 h5 38. Kpd2 Cg4 39. Л3f2 Cc5, 0:1.

* * *

У Гродне адбыўся фестываль «Кубак чорнай пешкі», у праграме якога быў шэраг дзіцячых турніраў. А ў бліцтурніры (80 удзельнікаў) прызёрамі сталі гросмайстар Кірыл Ступак (Беларусь), Хаджы Даўлетаў (Туркменія) і Раман Леінаў (Беларусь).

У Рагачове ў турніры па хуткіх шахматах (90 удзельнікаў) прызавую тройку склалі майстар ФІДЭ Юрый Барсук, міжнародны майстар Вячаслаў Зарубіцкі і гросмайстар Юрый Ціханаў, па «бліцы» (87 удзельнікаў) — майстар ФІДЭ Арцём Стрыбук, гросмайстар Андрэй Кавалёў і Юрый Барсук.

На Мемарыяле Р. Нежмэтдзінава ў Казані (170 удзельнікаў) Аляксей Аляксандраў заняў другое месца, Мікіта Маёраў — восьмае, Андрэй Жыгалка — чатырнаццатае.

Каманда школьнікаў з Оршы, якая раней выйграла рэспубліканскі фінал турніру «Белая ладдзя», згуляла ў аналагічным усерасійскім фінале ў Сочы і заняла 11-е месца з 79.

У бліцтурніры на сайце chess.com (636 удзельнікаў) Уладзіслаў Кавалёў быў васямнаццаты, Сяргей Жыгалка — дваццаць другі. Дзяніс Лазавік заняў другое месца ў міжнародным анлайн-турніры маладых шахматыстаў.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Фf1 Першыя правільна адказалі Ігар Ананіч, Васіль Жуковіч, Сяргей Цыльпук, Васіль Барысевіч, Віктар Жук, Фёдар Карпей.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# Спецвыпускі і прэм'еры да галоўнага свята

**Дзень Незалежнасці, 3 ліпеня, адзначаць на тэлеканалах Белтэлерадыёкампаніі тэматычнымі эфірамі, спецвыпускамі праектаў і паказамі шматлікіх кінафільмаў беларускай вытворчасці, сярод якіх і прэм'еры.**

У кампаніі аўтарытэтных гасцей і экспертаў у рамках маштабнага інфармацыйнага тэлеканала Агенцтва тэленавін будзе магчымасць пагаварыць пра самыя знакавыя дасягненні беларускага народа за гады свабоднага, суверэннага жыцця.

Гледачоў «Беларусь 2» чакае сюрпрыз ад тэлеканала, таму што тэматычны чатырохгадзінны выпуск любімага ранішняга шоу «Уключайся!» будзе выходзіць у гэты дзень у маляўнічых дэкарацыях вадасховішча Дразды: звыклы студыйны фон зменіцца панарамай сталіцы, святло пражэктараў — святлом сонца, а гатаваць будуць на беразе. Гасцямі спецыяльнага выпуску стануць прадстаўнікі беларускай IT-сферы і архітэктуры, культуры і прамысловасці, знакамітыя алімпійскія чэмпіёны, якія разам з вядучымі праграмы павіншуюць гледачоў з Днём Незалежнасці і раскажуць пра тое, чым кожны сапраўды можа ганарыцца.

Акрамя таго, сямейны тэлеканал пакажа шэраг дзіцячых казак вытворчасці «Беларусьфільма», «Прыгоды Бураціна», «Пра Чырвоны Каптурок», «Рыжы, шчыры, закаханы», а таксама кінааповесць Віктара Турава «Я родам з дзяцінства». Фінальнай нотай святочнага выпуску праграмы стане музычна-харэаграфічнае віншаванне ад каманды праекта з удзелам артыстаў Прэзідэнцкага аркестра і спецыяльнага госця — прадстаўніка Беларусі на XXX Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» Данііла Мышкаўца.

Эфір тэлеканала «Беларусь 3» у святочныя дні таксама будзе напоўнены кантэнтам айчыннай вытворчасці. Спецыяльна да Дня Незалежнасці тут адбудзецца прэм'ерны паказ новых дакументальных работ студыі гістарычных фільмаў «Майстэрня Уладзіміра Бокуна» з цыкла «100 імёнаў для Беларусі». У суботу ў эфір выйдзе фільм «Генерал Корж», прысвечаны вядомаму Герою Савецкага Саюза, стваральніку і камандзіру аднаго з першых партызанскіх атрадаў на тэрыторыі нашай краіны Васілю Захаравічу Каржу. А ўжо ў нядзелю аўдыторыю чакае расповед пра знакамітага астрафізіка, які жыў у XIX—XX стагоддзі, нашага таленавітага земляка, выпускніка слуцкай гімназіі № 1 Вітольда Карлавіча Цэраскага ў кінастужцы «Вітольд Цэраскі. «De Rebus Omnibus». А што датычыцца гульнявога кіно, то мы зможам паглядзець «Белыя росы», «Казку пра зорнага хлопчыка», «У жніўні 44-га...», «Дзяўчынка шукае тату», мультфільмы «Беларуская азбука» і «Чараўніцтва ў дзіцячым садку».



Ранішняе шоу «Уключайся!» выйдзе ў новых дэкарацыях.



Таксама не абыдзецца і без музычных падарункаў. Акрамя ўжо анансаванага тэлеканцэрта ў дзвюх частках «Маладыя таленты Беларусі», прагучаць і іншыя праграмы. Канцэрт фестывалю армейскай песні «Звязда», музычная праграма закрыцця Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2021», а таксама «Песні ваенных часоў» у выкананні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава і «Незабыўнае» са спадчыны ВІА «Песняры» ў канцэртнай праграме Пятра Ялфімава.

**Алена ДРАПКО.**